

**Маладыя выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прадставілі свае работы пад ужо знаёмай рубрыкай "Тры ў адным". Новы праект, наладжаны ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", склалі персанальныя выстаўкі Дзяніса Барсукова, Ксеніі Дзягілевай-Бяляевай і творчага дуэта Людмілы Дамнянковай ды Наталлі Адждзер.**



# Мажорны смак жыцця

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ, фота аўтара**

**Рэтраспектывай** жывапісу Дзяніса Барсукова, вядомага таксама сваімі работамі ў іншых відах выяўленчага мастацтва, сталася выстаўка "13". Не варта шукаць у самой назве сакральны сэнс: гэта проста лічба, якая фіксуе колькасць карцін, уключаных у экспазіцыю. А вось іх падбор скрупулёзна прадуманы: кожная работа звязаная з пэўным перыядам развіцця творчасці мастака за апошнія сем гадоў. Пры ўдумлівым разглядзе і параўнанні лаканічных і, здавалася б, знарочыста немудрагелістых, прасякнутых цеплынёй добрай усмешкі кампазіцый Д. Барсукова можна прасачыць градацыі яго жывапісных прыхільнасцей і захапленняў — ад постімпрэсіянізму да наіўнага мастацтва, ад глыбіннага ўплыву традыцый народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці да асэнсавання сучасных авангардных стыляў. Пазнавальнасць аўтарскага почырку — у імпульсіўнай манеры пазначаць контур і маляўнічыя акцэнты; у імкненні абстрагавацца ад неістотных дэталяў, супастаўляць, абыгрываць і гарманізаваць адкрытыя, часам "смачна" яркія колеры; арганізоўваць дэкаратыўны прадметны свет на палатне з адмысловай логікай дызайнерскага густу.

Праз нешматслоўнасць мастацкага выказвання дасягаецца сэнсавая афарыстычнасць выявы ("Дрэва шчасця", "Чалавек і мора", "Я п'ю з цукрам"). Праз імпрэсію колеру і наўмысную спрошчанасць малюнка нібы аднаўляюцца чысціня, свежасць і яскравасць дзіцячага ўспрымання звыклых рэчаў у штодзённасці, адчуваецца шчырае захапленне мастака самім жыццём ("Снеданне на лецішчы", "Восеньскі вецер", "Царква і аэраплан"). Нават у дысгарманічным сюжэце з рознакаляровымі, не па-дзіцячы агрэсіўнымі, выбуханоснымі папяровымі караблікамі ("Апакаліпсіс") адсутнічае безвыходная дэструктыўнасць, а ёсць неадступная трывога, сігнал перасцярогі, зварот да здаровага сэнсу ў прадчуванні вялікай небяспекі. Няма гнятлівай адзіноты ў паўночнай сцішанасці самотнага аранжавага коціка ("Пагладзь мяне"), бо гэты кранальны вобраз выпраменьвае такую абаяльнасць, пяшчоту і душэўную цеплыню!

**Пазітыўным** успрыманнем свету, радасцю жыцця ў яго будзённых праявах, удзячнасцю за кожны новы дзень як за вялікі падарунак уразіў жывапіс Ксеніі Дзягілевай-Бяляевай, прадстаўлены пад назваю "Сустрэча". Партрэты, нацюрморты, пейзажы, тэматычныя палотны, узоры іканапісу — карціны розных гадоў знітаваў лейтматыў: "Сустрэча з жыццём — цудоўны шанц". У ланцужку сустрэч — вобраз дарагога чалавека, таямніца знаёмага твару, спыненае імгненне фантазіі, хатнія рэчы, сямейная ідылія, цуд натхнення. Напэўна, і жывапіс для мастачкі — цудоўны шанц выказаць у творчым парыванні глыбокую, а таму някідкую любоў да самых-самых блізкіх: маці — вядомай актрысы і рэжысёра Галіны Дзягілевай ("Бенефіс"), шасцярых дзяцей ("Лявон" ды інш.), мужа — таленавітага гукарэжысёра Валерыя Бяляева ("Партрэт").

**Смак да Жыцця**, вытанчаны густ, мудрасць творчай задумы плюс майстэрства — складнікі поспеху дуэта Людмілы Дамнянковай ды Наталлі Адждзер, мастакоў па тэкстылі. Назву свайёй выстаўкі "Дзень пры дні" яны падтрымалі эпіграфам з Эклезіяста: пра тое, што род праходзіць і род прыходзіць, а зямля існуе спрадвек; што і вецер вяртаецца на кругі свае; што мора ніколі не перапаўняецца, бо рэкі, якія цякуць у яго, вяртаюцца да сваіх вытокаў і зноў імкнуцца да мора; што ўсе рэчы ў працы і не спатоліцца вока зрокам і не напоўніцца вуха слуханнем... Абудзіўшы да крэатыўнага жыцця тэхніку старажытнага лямцавага рамяства, мастачкі пашырылі ўспрыманне першароднай традыцыі. Іх аб'екты, створаныя з цёплага натуральнага матэрыялу, "правакуюць" на тактыльны кантакт і філасофскае суізіранне. У кампазіцыях Л. Дамнянковай ды Н. Адждзер выяўляюцца замкнёнасць і няспынная цыклічнасць быцця, чорна-белая рытміка яго законаў — праз першапачатковую загадкавасць нераскрытага бутона ды бясконцасць выпрастанага палатна жыцця.

*На здымках: Ксенія Дзягілева-Бяляева "Партрэт"; Дзяніс Барсукоў "Пейзаж з жоўтым домам".*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ